**Пагарэлаў, А.** Партызанскі камісар / А. Пагарэлаў // Віцебскі рабочы. – 1985. – 1 крас. – С. 3.

## ПАРТЫЗАНСКІ КАМІСАР

9 кастрычніка 1942 года выйшаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб устанаўленні поўнага адзінаначалля і скасаванні інстытута ваенных камісараў у Чырвонай Арміі. У партызанскім жа руху інстытут камісараў застаўся да канца вайны. Тут улічваліся асаблівасці барацьбы ў тыле ворага, а таксама велізарны аўтарытэт камісараў, які яны заслужылі яшчэ ў час грамадзянскай вайны.

На партызанскіх камісараў партыя, Савецкая дзяржава і народ ускладалі вялікія надзеі. І яны, як правіла, апраўдвалі іх, карысталіся вялікім давер'ем і любоўю партызан і насельніцтва. Адным з такіх адораных байцоў партыі быў Дзмітрый Пятровіч Левін.

Нарадзіўся ён у 1909 годзе, член партыі, кадравы вайсковец. Напярэдадні вайны быў сакратаром партбюро 131-га артылерыйскага палка, які стаяў на беразе Буга каля Брэсцкай крэпасці. Пад Бабруйскам цяжка паранены. Пасля папраўкі – ваенны камісар у 408-м мінамётным палку Рэзерву Вярхоўнага Галоўнага Камандавання, затым адкамандзіраваны ў 4-ю Ударную армію, дзе членам Ваеннага Савета быў першы сакратар Віцебскага абкома партыі І. А. Стулаў. У чэрвені 1942 года ён і накіраваў Д. П. Левіна на пасаду намесніка камісара 1-й Беларускай партызанскай брыгады. 10 жніўня 1942 года яго прызначылі адначасова і камісарам буйнейшага партызанскага атрада Курмялёва.

Дзмітрый Пятровіч даволі хутка пазнаёміўся з палітработнікамі і камуністамі атрада, знайшоў з імі агульную мову. Уся партыйна-палітычная работа ў падраздзяленнях ажывілася. Камісар умеў знаходзіць надзённыя матэрыялы як аб баявых аперацыях нашай арміі і самаахвярнай працы савецкіх людзей у тыле, так і з жыцця і дзейнасці атрада. У падраздзяленні і населеныя пункты дастаўляліся свежыя газеты, лістоўкі, кнігі, зводкі Саўінфармбюро. Асабліва гэта стала прыкметна, калі аднавіўся выхад газеты абкома партыі «Віцебскі рабочы».

У сярэдзіне жніўня 1942 года мы атрымалі газету «Правда» з перадавым артыкулам пад назвай «Партызаны, мацней удар па ворагу». Яго абмеркавалі на нарадзе камандзіраў і палітработнікаў. Было вырашана разграміць гарнізон праціўніка на чыгуначнай станцыі Залучча паміж Віцебскам і Гарадком.

Увечары перад выступленнем у паход новы камісар Д. П. Левін правёў з байцамі гутарку. Яго словы былі простыя, даходлівыя і гарачыя, поклічныя. Камісар быў у вайсковай форме, у пятліцах блішчала па дзве шпалы, на рукаве чырванела вялікая пяцікутная зорка. Гэта форма выклікала павагу. Гутарка камісара ўсім спадабалася, павысіла пачуццё абавязку і адказнасці.

Баявая аперацыя 28 жніўня 1942 года прайшла паспяхова. Партызаны разгромілі гарнізон праціўніка, знішчылі 30 гітлераўцаў і двух узялі ў палон. Здабылі трафеі: кулямёт, 25 вінтовак, пісталет. Былі ўзарваны стрэлкі, разбіта іншае станцыйнае абсталяванне. Рух паяздоў спыніўся на двое сутак.

Часта камісар ішоў у роты і ўзводы, каб данесці да кожнага партызана змест загадаў Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, паставіць канкрэтныя задачы па ўзмацненню барацьбы з захопнікамі.

Акупанты пасля паражэння пад Масквой, а затым і акружэння пад Сталінградам яшчэ больш абрушыліся на партызан. Яны і галоўнай задачай ставілі знішчэнне ўсіх, хто аказваў супраціўленне «новаму парадку». Многіх гналі ў фашысцкае рабства ў Германію. Палітработнікі і камандзіры атрада

растлумачвалі звярыны характар фашысцкіх заваёўнікаў, узмацнілі работу з насельніцтвам, стварылі нелегальны партызанскі рэзерв. Гэту работу ўзначаліў камісар атрада.

Вораг ішоў і на каварныя метады барацьбы з партызанамі, засылаў шпіёнаў, здраднікаў. Таму прымаліся меры да павышэння пільнасці.

Партыйная арганізацыя, палітработнікі атрада пад кіраўніцтвам камісара праводзілі вялікую работу па патрыятычнаму выхаванню партызан, арганізавалі падпіску на пазыку і іншыя ахвяраванні ў фонд абароны Радзімы. З асаблівым натхненнем збіралі сродкі на пабудову танкавай калоны «Партызан Беларусі». Толькі 8 студзеня 1943 года атрад імя Курмялёва перадаў у штаб брыгады сабраныя на гэту справу 5904 рублі і аблігацый на суму 670 рублёў.

Дзмітрый Пятровіч заўсёды, і асабліва ў крытычныя моманты бою, быў сярод партызан, смела вёў іх за сабой. У час лютаўска-сакавіцкай карнай экспедыцыі 1943 года, калі атрад трапіў у акружэнне ў раёне вёскі Вялікае Забарочча, ён выкарыстоўваў кожную свабодную хвіліну, каб пагутарыць з партызанамі. Яго можна было бачыць то ў адной, то ў другой роце. Расказваў партызанам аб паведамленнях маскоўскага радыё, зводках Саўінфармбюро. А весткі былі радасныя. Разгромлены гітлераўскія арміі пад Сталінградам, вызвалены Варонеж. Перайшлі ў наступленне Калінінскі і Заходні франты, 3-га сакавіка яны вызвалілі Ржэў і працягваюць наступаць, ідуць да нас.

Трэба было прабівацца з акружэння, інакш – гібель. І вось у гэты крытычны момант камісар паказаў сябе ўжо як смелы і знаходлівы камандзір. Ноччу ён узяў узвод разведкі і ўзвод Івана Салаўёва, выбраў удачнае месца і па кустах каля могілак праскочыў праз ачапленне праціўніка. Выбраўшыся на свабоду, камісар паклапаціўся, каб дапамагчы нам. Зайшоўшы па лесе ў тыл ворага, партызаны напалі на карнікаў, а мы атакавалі іх па фронту. Гітлераўцы не чакалі такога павароту. Страціўшы каля трыццаці салдат, яны разбегліся з гэтага ўчастка. а атрад выйшаў са смяротнага кальца.

Камісар яшчэ не раз вадзіў партызан у атаку. Трымаўся ўвесь час бадзёра, хоць некалькі сутак ужо не спаў: твар пачарнеў, вочы запалі. Камандзіры і партызаны захапляліся храбрасцю і вытрымкай камісара, імкнуліся браць з яго прыклад.

Пра кожны бой, гераізм асобных партызан і камандзіраў Д. П. Левін падрабязна паведамляў у сваіх данясеннях у штаб брыгады. У студзені 1943 года яго ўвялі ў састаў бюро Суражскага падпольнага райкома партыі.

Аднойчы ў майскія дні, калі лес адзяваўся ў вясенняе ўбранне і ўсё поўнілася духмяным водарам, Дзмітрый Пятровіч зусім сур'ёзна сказаў:

– Скончыцца вайна, пайду працаваць лесніком у гэтых мясцінах.

Мара не збылася.

Гітлераўскае камандаванне к лету 1943 года ў раёне дыслакацыі атрада імя Курмялёва сканцэнтравала буйныя сілы. Мясцовае насельніцтва амаль поўнасцю было выгнана. У сувязі з гібеллю ў маі Ф. Ф. Новікава камандаванне атрадам прыняў на сябе Д. П. Левін. Суражскі падпольны райком партыі 7 ліпеня 1943 года прыняў рашэнне вывесці атрад за лінію фронта на адпачынак. Атрад быў разбіты на пяць груп. Штаб выходзіў апошнім. Пры пераходзе лініі фронта ноччу з 16 на 17 ліпеня ў жорсткім баі ў раёне вёсак Шыцікі – Дразды Дзмітрый Пятровіч Левін па-геройску загінуў. Так аддаў жыццё за Радзіму любімец партызан, адзін з адважных палітработнікаў 1-й Беларускай партызанскай брыгады.

**А. ПАГАРЭЛАЎ,**

**былы камандзір партызанскага атрада 1-й Беларускай партызанскай брыгады**